**Л.Ф.Голікава,** *дацэнт*

# РОЛЯ ГІСТАРЫЧНЫХ МУЗЫЧНА-ТЭАТРАЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ РЭЖЫСЁРСКІХ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

Лекцыйныя курсы па гісторыі музыкі і гісторыі тэатра, якія ў сукупнасці з практычнымі спецыяльнымі дысцыплінамі вывучаюцца студэнтамі спецыялізацыі «тэатральная творчасць», садзейнічаюць падрыхтоўцы спецыяліста-рэжысёра высокай кваліфікацыі, прыстасаванага як да мастацкай, творчай, арганізацыйнай работы, так і да педагагічнай, і навукова-даследчай дзейнасці. Як зазначаў К.Станіслаўскі, будучы рэжысёр або акцёр «павінен паклапаціцца аб сваіх адукацыі і выхаванні», бо, «каб вытлумачыць творы геніяў, патрэбна іх тонка адчуваць і разумець, а каб разумець іх, трэба быць адукаваным чалавекам» [1]. Іншымі словамі, каб «дабрацца да думкі аўтара ... трэба іх (думкі. – *Л.Г.*) адчуць, перадумаць хаця б палову таго, што перадумаў аўтар, пранікнуцца духам твора» [2]. І ў гэтым сэнсе вывучэнне гісторыі тэатра ці гісторыі музыкі дае навучэнцу магчымасць максімальна пашырыць свой кругагляд, развіць уменні «глядзець наперад», ведаць і адчуваць тое, што «робіцца навокал» [3].

Праблема выкладання курсаў гістарычных музычна-тэатральных дысцыплін востра ставілася яшчэ ў перыяд фарміравання вышэйшай музычна-тэатральнай педагогікі. Першыя крокі ў гэтым кірунку ў галіне музычнага мастацтва былі зроблены ў XIX ст. А.Сяровым («Аб гісторыі музыкі як вучэбным прадмеце»), Г.Ларошам («Аб гістарычным вывучэнні музыкі») [4]. У XX ст. на гэту праблему ўказваў Б.Асаф'еў («Выбраныя артыкулы аб музычнай асвеце і адукацыі»), Ю.Келдыш («Яшчэ аб выкладанні гісторыі музыкі»), а таксама Т.Ліванава, Р.Грубер, М.Друскін і інш. У галіне тэатральнага мастацтва пытанні прафесійнай адукацыі акцёра і рэжысёра неаднаразова ўзнімаліся ў працах К.Станіслаўскага («Аб значэнні адукацыі для артыста»,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

«Літаратурны аналіз»), Б.Пакроўскага («Рэжысура музычнага тэатра»), Н.Гарчакова, Г.Таўстаногава і інш.

Аднак нягледзячы на тое, што ў вышэйпералічаных публікацыях ўзнімалася пытанне аб абавязковым выкарыстанні пры выкладанні вучэбных курсаў прынцыпу гістарызму, у рэальнай педагагічнай практыцы спецыфіка вывучэння, напрыклад гісторыі музыкі, зводзілася да разгляду індывідуальнай творчасці кампазітараў (манаграфічны прынцып выкладання прадмета), у лепшым выпадку музычных стыляў і напрамкаў у мастацтве. Тым самым музыка не разглядалася ў якасці арганічнай часткі мастацка-культурнага асяроддзя, г.зн. не была па сутнасці гістарычнай дысцыплінай. Тое ж можна сказаць і аб гісторыі тэатра, якая пераўтваралася часта ў ланцуг творчых партрэтаў драматургаў, акцёраў, рэжысёраў.

Разам з тым сучасны ўзровень універсітэцкай мастацкай адукацыі патрабуе вывучэння гістарычных музычна-тэатральных дысцыплін перш за ўсё як гісторыі сусветнай і айчыннай музычнай і тэатральнай культуры. Гэта дазваляе сфарміраваць мастацка-гістарычнае мысленне студэнта-рэжысёра, накіраванае на дакладнае прыняцце і ацэнку ім канкрэтных з'яў гістарычнага мінулага і сучаснасці.

Курс гісторыі музыкі пры вялікім аб'ёме вывучаемага матэрыялу (замежная, руская, беларуская музыка) мае абмежаваную колькасць вучэбных гадзін, што, у сваю чаргу, абумоўлівае спецыфіку яго выкладання. Так, асноўная ўвага надаецца больш значным, буйным пытанням развіцця музычнага мастацтва ў яго гістарычнай узаемасувязі (напрыклад, станаўленню оперы як жанру ў эпоху барока). У той жа час больш канкрэтныя дэталі, якія дазваляюць падрабязна аналізаваць музычныя творы, аб'ектыўна адсутнічаюць [5]. Студэнты-рэжысёры знаёмяцца з агульным напрамкам развіцця музычнай культуры. Матэрыял, які ім паведамляецца, дапамагае расставіць свайго роду мастацкія арыенціры з найбольш значнымі вяхамі, якімі адзначаны характэрныя этапы гістарычнай эвалюцыі музычнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне гісторыі тэатра будучымі рэжысёрамі вымагае ўзаемасувязі гістарычнай тэатральнай дысцыпліны з дысцыплінамі практычнымі, перш за ўсё з рэжысурай, сцэнічнай мовай і інш. Праблема суаднясення гісторыі і тэорыі ў працэсе падрыхтоўкі прафесіянала ставілася яшчэ ў XIX ст.: «Без гісторыі прадмета няма тэорыі прадмета, аднак і без тэорыі прадмета (які на практыцы тлумачыць, "як" рабіць, "што" і "якім чынам". – *Л.Г.*) няма нават думкі аб яго гісторыі, таму што няма ўяўлення аб прадмеце, яго значэнні і межах» [6]. Іншымі словамі, калі спаслацца на трапную заўвагу К.Станіслаўскага, «няхай аналіз раскладзе п'есу на яе састаўныя часткі, г.зн. раскрые канву, на якой вышыта карціна, і ясна вызначыць канчатковую мэту. Пазнаўшы структуру п'есы або ...мэту творчасці», будучы рэжысёр «не разыдзецца з аўтарам у канчатковых мэтах творчасці» [7]. «Аналіз патрэбны ...для таго, каб пазнаваць самую сутнасць твора» (выдзелена намі. – *Л.Г.*), якая «старанна схавана паміж радкамі тэксту» [8]. Будучы спецыяліст «падобна майстру павінен ведаць пабудову або механізм твора ...і яго дзеянне ці развіццё»[9], паколькі ў творчасці любога значнага мастака «сістэма прыёмаў пісьма ў кожным асобным выпадку вызначана стылем мастацтва той ці іншай эпохі і дакладна яго выяўляе» [10].

Па гэтай прычыне гістарычныя курсы выкладаюцца перш за ўсё з мэтай навучыць студэнта-рэжысёра не толькі аналізаваць прапанаваны тэкст (драматычны, у асобных выпадках і музычны), але і думаць на мове тэатральнага (у некаторай ступені і музычнага) мастацтва. Курс «Музыка ў спектаклі» як цалкам тэарэтычны дапамагае дапоўніць і пашырыць, «дэталізаваць» агульнагістарычныя звесткі, якія выкладаюцца ў лекцыйным курсе па гісторыі музыкі.

Падчас вывучэння курсаў звычайна выкарыстоўваюцца наступныя тыпы лекцый: 1) агляднага характару, на якіх студэнты атрымліваюць уяўленне аб перспектыве агульнага працэсу развіцця мастацтва пэўнага гістарычнага перыяду; 2) лекцыі –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стылявыя «партрэты» эпохі, у тым ліку і найбольш яркіх яе прадстаўнікоў, дзе навучэнцы знаёмяцца з дасягненнямі сусветнага і айчыннага тэатральнага і музычнага мастацтва; 3) лекцыі-агляды па жанрах мастацтва, як тэатральнага, так і музычнага. Апошні тып лекцый даволі эфектыўны ў спалучэнні з гісторыка-стылявым «партрэтам» эпохі ці творчасці драматурга або кампазітара і дазваляе прасачыць эвалюцыю як у жанравай сферы, так і ў галіне стылістыкі. На думку Б.Пакроўскага, мастацкі стыль – гэта «люстэрка эпохі».

Часта накіраванасць тэмы лекцыі больш падрабязна разглядаецца на семінарах на прадметах музычна-тэатральных «гісторый», а потым яе матэрыял замацоўваецца на практычных занятках. Менавіта такая ўзаемасувязь гістарычных і практычных курсаў аказваецца дзейснай формай развіцця ў студэнтаў навыкаў не толькі самастойнага мыслення, але і выпрацоўкі актыўнага інтарэсу да прадмета.

Мэта выкладання гістарычных дысцыплін у сувязі з практычным іх выкарыстаннем заключаецца ў тым, каб адзінкавае, асаблівае (тэатральная ці музычная п’еса) успрымаліся як адлюстраванне эпахальнага, агульнага і адначасова разглядаліся праз непаўторна індывідуальны стыль творцы. Таму знаёмства з гістарычнымі помнікамі тэатральна-музычнага мастацтва скрозь прызму канкрэтных жанраў ці твораў пэўнага стылявога напрамку, праз засваенне спецыфічнай мовы мастацтва, праз вывучэнне драматычнага, часам і музычнага вобраза падаецца найбольш важным у працэсе падрыхтоўкі студэнтаў рэжысёрскіх спецыяльнасцей.

Такім чынам, вывучэнне гістарычных мастацтвазнаўчых дысцыплін – гісторыі музыкі і гісторыі тэатра – адыгрывае значную ролю ў працэсе фарміравання і развіцця навыкаў будучага спецыяліста-рэжысёра, спрыяе агульнаму ўзбагачэнню культурнага ўзроўню студэнтаў. Усё гэта садзейнічае эфектыўнасці працэсу навучання і пазнання, павышэнню ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі рэжысёра. На гэтым кірунку найбольш перспек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўным у галіне выкладання гісторыі тэатра і музыкі з'яўляецца ўстанаўленне ўзаемасувязей тэарэтычных і практычных формаў пры вывучэнні названых прадметаў, што ўзмацняе цікавасць навучэнцаў да мастацкіх гістарычных дысцыплін і прафесійных ведаў, садзейнічае больш якаснаму засваенню імі практычных спецыяльных курсаў.

*1. Станиславский К.С.* О значении образования для артиста // Станиславский К.С. Мое гражданское служение России. – М., 1990. – С. 525.

2. Там жа.

*3. Станиславский К.С.* После спектакля «Мудреца» // Станиславский К.С. Мое гражданское служение России. – М., 1990. – С. 573.

4. Г.Ларош лічыў неабходным прымяняць гістарычны падыход і да вывучэння тэарэтычных дысцыплін (гл. яго артыкул «Гістарычны метад выкладання тэорыі музыкі»).

5. Падобная «дэталізацыя» пры вывучэнні курса гісторыі музыкі характэрная для студэнтаў-музыкантаў.

*6. Чернышевский Н.Г.* Избранные философские сочинения. – М., 1950. – Т.1. – С. 303.

*7. Станиславский К.С.* Литературный анализ // Станиславский К.С. Мое гражданское служение России. – М., 1990. – С. 579.

8. Там жа, с. 580.

9. Там жа, с. 581.

*10. Покровский Б.* Введение в оперную режиссуру // Режиссура музыкального театра: для театральных вузов. – М., 1985. – С. 6.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ